Хрысьціянскі Праваабарончы Дом

# Маніторынг парушэньняў правоў хрысьціянаў у Беларусі ў 2006 годзе

KAMUNIKAT.org

Менск 2007

Шаноўныя сябры!
Прадстаўляем вашай увазе Маніторынг парушэньняў правоў хрысьціянаў, праведзены ініцыятывай ХРЫСЬЦІЯНСКІ ПРАВААБАРОНЧЫ ДОМ

KAMUNIKAT.org

# «Для защиты своих прав беларуские христиане впервые прибегли к крайним мерам»

***Комментарий юриста Дины Шавцовой к «Мониторингу нарушений прав христиан в 2006 году».***



Основываясь на информации, собранной в рамках Мониторинга нарушений прав христиан, следует особо отметить тот факт, что в 2006 году верующих стали подвергать административным арестам за религиозную деятельность, а именно за проведение религиозных мероприятий (богослужений и семинара) без соответствующего разрешения местного исполнительного и распорядительного органа. Законодательное основание для применения мер административной ответственности за проведение религиозного собрания без соответствующего разрешения появилось в 1999 году — известный Декрет Президента Республики Беларусь № 36 (принят после трагических событий на Немиге); впоследствии определенные нормы появились в Законе РБ «О массовых мероприятиях», Законе РБ «О свободе совести и религиозных организациях», также была «подкорректирована» ст. 167-1 Кодекса об административных правонарушениях РБ (КоАП РБ). Поначалу за богослужения без соответствующего разрешения верующим выносили предупреждения, затем стали применять штрафы, а в 2006 году — административные аресты. Это опасная тенденция. Ведь может дойти и до введения уголовной ответственности за религиозную деятельность без государственного разрешения, как это было в советские времена.

В связи с этим необходимо напомнить нашим законодательным и правоприменительным органам, что Беларусь взяла на себя обязательства по ряду международных договоров, которыми закреплено право граждан на свободу совести и вероисповедания, на исповедание религии как единолично, так и сообща с другими, на свободное распространение своих религиозных убеждений. При этом «свобода исповедовать религию или убеждения подлежит лишь ограничениям, установленным законом и необходимым для охраны общественной безопасности, порядка, здоровья и морали, равно как и основных прав и свобод других



лиц» (п. 3 ст. 18 Международного пакта о гражданских и политических правах).

Особо отличают 2006 год следующие факты:

— размер применяемых в качестве меры ответственности штрафов за проведение религиозных мероприятий без разрешений значительно увеличился;

— отказ государственных органов большому количеству иностранных священнослужителей, особенно католических, в согласовании религиозной деятельности по причинам, не основанным на законе;

— впервые в 2006 году верующие различных конфессий (евангельской и католической) при отстаивании своих религиозных прав прибегли к такой крайней мере, как голодовка.

В Законе РБ «О свободе совести и религиозных организациях» в редакции 2002 года (предыдущий Закон «О свободе вероисповедания и религиозных организациях» был принят в 1992 году) появились такие нормы, которые на практике ограничивают право на свободу религии, в частности на совместное исповедание религии путем проведения богослужений (религиозных собраний). Часть первая ст. 14 Закона устанавливает, что «религиозной общиной признается объединение в пределах территории одного или нескольких населенных пунктов группы граждан Республики Беларусь, являющихся приверженцами единого вероисповедания, для совместного исповедания веры и удовлетворения иных религиозных потребностей», а в части первой ст. 16 утверждается, что «религиозные организации подлежат обязательной государственной регистрации». Получается, если десять или пятнадцать единоверцев в одном населенном пункте, хотят регулярно собираться вместе для молитв, изучения Библии, то они по действующему Закону должны в обязательном порядке зарегистрировать религиозную общину. А чтобы зарегистрировать общину, необходимо не только иметь в своем составе не менее двадцати членов, но также найти подходящее помещение для юридического адреса, подготовить устав и соблюсти другие формальности.

Если религиозная община не зарегистрирована, то какие-либо проводимые ею религиозные собрания по нынешнему законодательству являются незаконными и влекут ответственность по ст. 193 КоАП РБ. Ранее, особенно до 1999 года, верующие с такими проблемами не сталкивались. В единичных случаях, когда граждан привлекали к ответственности по ст. 193 КоАП РБ, в судебном порядке такие постановления чаще всего отменялись.

Есть еще одна серьезная проблема, созданная законодательством, в том числе и Законом. Если религиозная община зарегистрирована, но проводит свои богослужения в здании, не являющимся культовым (дом культуры, частный дом и т. п.), без соответствующего разрешения, то организатора могут привлечь к административной ответственности по ст. 167-1 КоАП РБ. Из Мониторинга видно, что верующих чаще всего привлекали к ответственности именно по этой статье.

Для того чтобы не поддаваться давлению в первую очередь необходимо знать свои права, которые закреплены в нормах Конституции РБ и международных актах. Если гражданина привлекают к административной ответственности, то, как участник соответствующего процесса, он наделен рядом прав, которые закреплены в Кодексе об административных правонарушениях. Гражданин всегда имеет право на обжалование незаконных действий должностных лиц и незаконных актов. «Каждому гарантируется защита его прав и свобод компетентным, независимым и беспристрастным судом в определенные законом сроки» (ст. 60 Конституции Республики Беларусь). Чтобы эффективно защитить нарушенное право, конечно же, лучше всего обратиться за помощью к профессиональному юристу, который сможет оказать квалифицированную правовую помощь.

## «Бороться за свои права можно и в нашем государстве»

***Комментарий Сергея Луканина, юриста религиозной общины Союза Христиан Полного Евангелия «Новая жизнь», г. Минск.***



Вне всяких сомнений, в вопросе нарушения прав верующих в Республике Беларусь мы сталкиваемся именно с проявлением государственной идеологии, а не с перегибами на местах.

Проводя в жизнь свою идеологию, государство наделило государственные органы по делам религий огромными полномочиями. В некоторых соответствующих положениях прямо указано о наделении данных органов функциями контроля за деятельностью церкви. Госорганы по делам религий не только контролируют, но и вмешиваются в деятельность церквей. Пример с трудоустройством католических священников является в этом плане весьма выразительным.

Сложно отстаивать права верующих в такой ситуации — ведь нам противостоит вся государственная машина с милицией, судами, различными контролирующими органами. Но основной проблемой остается пассивная позиция самих верующих, позиция, отчасти основанная на страхе, который господствует в беларуском обществе.

Однако мы видим, что государственная власть, создавшая атмосферу страха и подавления инакомыслия, оказывается неспособной противостоять смелым, дерзновенным выступлениям верующих в защиту своих конституционных прав.

Пример с церковью «Новая жизнь» является воодушевляющим. В 2002 году церковь приобрела на законном основании здание коровника. Не получив от властей разрешения на строительство нового или на реконструкцию имеющегося здания, верующие просто отремонтировали коровник, не нарушая ни габариты, ни планировку. В 2004 году здание было полностью восстановлено и подготовлено для проведения богослужений, но власти не разрешили верующим проводить богослужения даже в собственном здании, не потрудившись при этом обосновать свой запрет нормами закона.

На общем собрании верующих было принято решение проводить богослужения в собственном здании без разрешения властей. Альтер-

KAMUNIKAT.org

нативы просто не было — все без исключения райисполкомы г. Минска отказали нам в проведении богослужений на их территории.

Третий год верующие церкви «Новая жизнь» ведут нелегкую борьбу с государственной машиной, но факт остается фактом: ни на минуту здание церкви не было закрыто, каждый день в нем проходят богослужения, молитвы и другие мероприятия.

На собственном опыте мы убедились, что бороться за свои права можно и в нашем государстве, надо просто освободиться от оков лжи и страха. Бог всегда на стороне правды.

Только далекий от действительности человек может не видеть тех перемен, которые происходят сейчас в обществе и государстве. Активная позиция каждого человека, отстаивание правды, несогласие с ложью, отсутствие компромисса со своей совестью — это залог скорейшего наступления новой общественной реальности, где свобода, справедливость, стремление к истине станут основой духовного климата.

# Маніторынг парушэньняў правоў хрысьціянаў у Беларусі ў 2006 годзе

KAMUNIKAT.org

## За сэмінар з удзелам служыцеля пратэстанцкай царквы звольнена 15 супрацоўнікаў дома культуры г. Валожына, Менская вобл.



*Раённы Дом культуры г. Валожына, Менская вобл.*

28 сьнежня 2006 г. зь ініцыятывы аддзела культуры Валожынскага райвыканкаму ў Доме культуры прайшоў сэмінар на тэму сям'і з удзелам Уладзімера Голікава, служыцеля менскай царквы «Дабравесьце». Уваход на мерапрыемства быў вольным, у залі прысутнічала каля 40 чалавек. На дваццатай хвіліне сэмінара выступ служыцеля быў перарваны намесьнікам старшыні Валожынскага выканкаму па ідэалягічнай працы А. Бобрыкам, які запатрабаваў неадкладна спыніць лекцыю.

Праз два дні, **30 сьнежня**, была праведзеная пазачарговая нарада райвыканкаму, на якой было прынятае рашэньне аб звальненьні пятнаццаці супрацоўнікаў Дома культуры.

Сяргей Яску, пастар мясцовай царквы «Вефіль» Эвангельскіх Хрысьціянаў Баптыстаў так пракаментаваў сытуацыю: «Рашэньне, прынятае выканкамам, неправамоцнае. Прадстаўнікі ўлады ўжо даўно спрабуюць ліквідаваць усякае супрацоўніцтва эвангельскіх хрысьціянаў з грамадзкімі арганізацыямі. Напрыклад, пасьля правядзеньня ў школах Валожына спартовага клюбу «Авана», веруючым нашай царквы было забаронена наведваць любыя ўстановы адукацыі. Больш таго, праз аддзел адукацыі за подпісам намесьніка старшыні па ідэалёгіі А. Бобрыка, выйшла распараджэньне распытаць школьнікаў, якую нядзельную школу яны наведваюць. Калі дзеці адказвалі, што пратэстанцкую, то выкладчыкі павінны былі паразмаўляць з бацькамі гэтых дзяцей. Мы, як царква і як прыватныя асобы, зараз пазбаўленыя права наведваць грамадзкія мерапрыемствы і іх арганізоўваць».



## Ліквідавалі грамадзкую арганізацыю «Пакаленьне». Прычына ліквідацыі — рэлігійная дзейнасьць сябраў арганізацыі

**25—26 студзеня** адбылося паседжаньне Вярхоўнага Суда РБ, дзе на павестку дня было вынесенае пытаньне аб ліквідацыі Міжнароднай грамадзкай арганізацыі «Пакаленьне». Фармальнай падставай стала заява з боку Мінюста пра адсутнасьць у арганізацыі юрыдычнага адрасу і зьвязаныя з гэтым неаднаразовыя парушэньні заканадаўства. Узначальваў аб'яднаньне вернік царквы Эвангельскіх Хрысьціянаў Баптыстаў Глеб Ярмакоў. Сваімі мэтамі ГА «Пакаленьне» бачыла працу з моладзьдзю і асьветніцтва. На судзе сябрам арганізацыі ў віну ставілася рэлігійная дзейнасьць.

У выніку абвінавачваньне не было даказана і адхіленае судом, аднак на рашэньне аб ліквідацыі гэта не паўплывала. Трэба зазначыць, что арганізацыя згубіла юрыдычны адрас пасьля візыту прадстаўнікоў АБЭЗ ва ўстанову, якая прадстаўляла памяшканьне для юрыдычнага адрасу ГА «Пакаленьне».

## За багаслужэньне — у турму



*Пастар Георгі Вязоўскі*

**3 сакавіка** пастар менскай баптысцкай царквы «Запавет Хрыста» Георгі Вязоўскі быў асуджаны на 10 сутак адміністрацыйнага арышту за правядзеньне багаслужэньня без адпаведнага дазволу (арт. 167-1 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэньнях). Рашэньне вынес суд Партызанскага раёну г. Менска.

Пасля візыту на нядзельнае служэньне супрацоўніка адміністрацыі Партызанкага раёну Н. Філіпкова і ўчастковага міліцыянта на пастара быў складзены пратакол,

у якім, у прыватнасьці, было запісана, што пастар Г. Вязоўскі «паўторна праводзіў рэлігійны сход у сваім уласным жылым доме... з правядзеньнем малітваў і рэлігійных сьпеваў... без адпаведнага дазволу. Прысутнічала каля дваццаці чалавек».

Н. Філіпкоў і ўчастковы прайшлі ў прыватны дом, ня маючы на гэта дазволу гаспадара памяшканьня і здымалі прысутных на фотакамэру, чым парушылі арт. 29 Канстытуцыі РБ аб недатыкальнасьці жытла.

Суд прызнаў пастара віноўным, і, улічваючы тое, что за падобнае парушэньне Г. Вязоўскаму ўжо было вынесенае папярэджаньне, суд прызначыў яму самае жорсткае пакараньне — 10 сутак арышту.

Рэлігійная грамада «Запавет Хрыста» налічвае каля 40 чалавек, служэньні праводзяцца ў прыватным доме ў Менску.

13 сакавіка, пасля заканчэньня тэрміну арышту, каб сустрэць пастара Г. Вязоўскага са спэцпрыёмніка-разьмеркавальніка каля брамы СПР на вул. Акрэсьціна сабралося каля 30 чалавек. Людзі былі адціснутыя АМАПам на адлегласць 200—300 мэтраў ад будынку спэцпрыёмніка. Сустрэць пастара дазволілі толькі жонцы і бацькам Г. Вязоўскага.

## Вярхоўны Суд ліквідаваў РГА «Саюз праваслаўнай моладзі імя Сьвятога Георгія Пераможцы»



*Катэдральны сабор Святога Духа, г. Менск*

**3 сакавіка** рашэньнем Вярхоўнага Суду ліквідавана арганізацыя праваслаўнай моладзі «Саюз праваслаўнай моладзі імя Сьвятога Георгія Пераможцы». Позва аб ліквідацыі ў Вярхоўны Суд была перададзеная Міністэрствам юстыцыі.

На момант ліквідацыі «Саюз праваслаўнай моладзі» ачольваў



вядомы грамадзкі дзеяч Мікола Астрэйка. Грамадзкае аб’яднаньне было зарэгістраванае 12 красавіка 1999 году. Рашэньне аб ліквідацыі вынесла судзьдзя Вярхоўнага Суду Ларыса Філіманіхіна.

## На Сяргея Цвора, біскупа Саюза Хрысьціянаў Веры Эвангельскай па Менская вобласьці, заведзеная адміністрацыйная справа



*Сяргей Цвор, біскуп Саюза Хрысьціянаў Веры Эвангельскай па Менскай вобласьці*

Адміністрацыйная справа па арт. 167-1 была заведзеная ў судзе Маскоўскага раёна г. Менска на Сяргея Цвора, біскупа Саюза ХВЭ ў Менскай вобласьці. Аб гэтым стала вядома **13 сакавіка** 2006 году. Біскупу інкрымінуецца адказнасьць за тое, што ў будынку на вул. Курганнай (Малінаўка), які зьяўляецца прыватнай уласнасьцю С. Цвора, адбываюцца багаслужэньні. Гэтыя сходы разглядаюцца ўладамі як «правядзеньне масавых рэлігійный сходаў у непрадугледжаным дзеля гэтага месцы», без дазволу выканкаму, і таму парушаюць арт. 167 Адміністрацыйнага Кодэксу. Парушэньне караецца арыштам на тэрмін ад 3 да 15 сутак, альбо штрафам ад 30 да 150 мінімальных адзінак (ад 900 тысячаў да 4,5 млн рублёў). Аднак у выніку справа была закрытая і да суду не дайшла.

## На Кастрычніцкай плошчы арыштаваны галава баптыстаў Грузіі

Падчас пасьлявыбарчых акцыяў пратэсту ў Менску, вечарам **20 сакавіка**, былі затрыманыя тры грамадзяніна Грузіі: Ладо Гагіяшвілі, дырэктар Цэнтру рэлігійных даследваньняў Грузіі, дыякан Басіл Кахабідзэ і Малхаз Сангулашвілі, глава Аб'яднаньня баптысцкіх цэркваў Грузіі, а таксама быў арыштаваны грамадзянін Беларусі, які іх суправаджаў. Пасля сутак у няволі, допытаў і нават пагрозаў расстрэлам, а таксама афіцыйнага пратэсту МЗС і парлямэнту Грузіі, грамадзян замежнай краіны дэпартавалі на радзіму.

«Я быў у вопратцы сьвятара, таму прадстаўнікам беларускай улады было вельмі лёгка мяне заўважыць, — паведаміў біскуп Малхаз Сангулашвілі. — Улада ў асобе КДБ адмоўна паставілася да нас як да прадстаўнікоў рэлігійных арганізацыяў. Яны лічаць, што служыцелі цэркваў ня маюць права ўмешвацца ў палітычную барацьбу. Гэтае ўмяшальніцтва яны ўбачылі ў тым, што мы прыехалі ў Менск і хацелі памаліцца з народам на Кастрычніцкай плошчы. Галоўнае нашае сьведчаньне заключаецца ў наступным: як вернікі, так і нехрысьціяне павінны прымаць удзел у вызваленьні беларускага народу. Гэты народ заслугоўвае свабоды і дэмакратыі».






## Каталіцкі сьвятар асуджаны на 10 сутак зьняволеньня



*а. Андрэй Сідаровіч*

У ноч на **24 сакавіка** а. Андрэй Сідаровіч з Воршы, манах каталіцкага Ордэну Марыянаў быў затрыманы разам з удзельнікамі намётавага мястэчка на Кастрычніцкай плошчы ў Менску. Каталіцкі сьвятар быў асуджаны на 10 сутак зьняволеньня. Пакараньне а. Андрэй адбыў у Жодзінскай турме.

На плошчы сьвятар займаўся душпастырскай працай з жыхарамі намётавага мястэчка.

## Юрыст Сяргей Шаўцоў асуджаны на 10 сутак за арганізацыю сэмінара з удзелам замежнага прапаведніка



*Юрыст Сяргей Шаўцоў з жонкай*

З **22 па 24 сакавіка** ў Менску праходзіў сэмінар аб хрысьціянскім сьветапоглядзе і яго ўплыве на розныя сфэры жыцьця. Сэмінар праводзіў Дэраў Мілер, аўтар кнігі «Навучыце народы». Арганізатарам выступіла арганізацыя «Хрысьціянская Дзелавая Ініцыятыва». Сэмінар праходзіў у адной з кавярняў Менску.

На трэці дзень сустрэчы ў памяшканьне кавярні ўвайшлі прадстаўнікі міліцыі і КДБ і абвясьцілі сэмінар незаконным. На Сяргея Шаўцова, верніка з пратэстанцкай царквы, быў складзены пратакол, як на арганізатара «масавага несанкцыянаванага мерапрыемства». Суд прызнаў яго віноўным па арт. 167 Адміністрацыйнага кодэксу. Адразу ж пасьля суду С. Шаўцоў быў дастаўлены ў спэцпрыёмнік-разьмеркавальнік для адбыцьця тэрміну арышту.

kamunikat.org

## За словы зь Бібліі на плякаце — штраф 5,5 мільёнаў рублёў

**5 красавіка** грамадзкі актывіст з г. Віцебска Барыс Хамайда быў аштрафаваны на 180 базавых велічынь. Прычынай адміністрацыйнага пераследу стаў плякат з цытатай зь Бібліі «Той, хто вытрымае ўсё, уратуецца!», зь якім Б. Хамайда выйшаў у цэнтр гораду, пратэстуючы супраць папярэдніх вынікаў галасаваньня на выбарах прэзідэнта.

Супрацоўнікі міліцыі Чыгуначнага РАУС г. Віцебска расцанілі словы з Эванельля паводле Мацьвея як «выказваньне грамадзкіх і палітычных інтарэсаў». Судзьдзя Чыгуначнага суду г. Віцебска Юры Урбан аштрафаваў Б. Хамайду на 5 мільёнаў 580 тысяч рублёў за правядзеньне несанкцыянаванай акцыі. Барыс Хамайда сваёй віны не прызнаў і з рашэньнем суду не пагадзіўся.

## Сям'ю Васіля Юрэвіча, адміністратара царквы «Новае жыцьцё», выключылі з асацыяцыі шматдзетных сем'яў

Эвагельскія веруючыя Сьвятлана і Васіль Юрэвічы, бацькі чатырох дзяцей, у сярэдзіне траўня атрымалі паведамленьне пра выключэньне зь беларускай Асацыяцыі шматдзетных сем'яў. Прычынай выключэньня сталася тое, што Юрэвічы выступілі супраць палітызацыі дзіцячага спартовага сьвята «Мама, тата, я — дружная сям'я», у якім удзельнічалі іх дзеці. Сьвята адбывалася ў сярэдзіне траўня 2006 года.



*Васіль і Сьвятлана Юрэвічы зь дзецьмі*



Паводле загаду чыноўнікаў, перад пачаткам спаборніцтваў павінна была адбыцца цырымонія ўзьняцьця сьцяга пад гукі гімна. Падчас гэтай цырымоніі дзеці павінны былі стаяць і глядзець на сьцяг. Гэта абурыла бацькоў. У выніку Васілю і Сьвятлане Юрэвічам забаранілі прыводзіць дзяцей на спаборніцтвы і выключылі іх сям'ю з Асацыяцыі шматдзетных сем'яў з фармулёўкай «за непавагу да дзяржаўных сымбаляў».

## Пастара абавязалі выплаціць штраф за правядзеньне багаслужэньня

**18 траўня** адміністрацыйная камісія выканкаму г. Кобрына, Берасьцейскай вобласьці прызнала пратэстанцкага пастара Ільлю Радкевіча вінаватым у парушэньні арт. 193 КоАП і абавязала яго выплаціць штраф у памеры 150 тыс. рублёў. Артыкул 193 КоАП прадугледжвае адказнасьць за парушэньне Закона «Аб свабодзе веравызнаньня і рэлігійных арганізацыях».

Паводле словаў Галіны Куксюк, сакратара адміністрацыйнай камісыі Кобрынскага выканкаму, сутнасьць правапарушэньня была ў тым, што рэлігійная суполка, якая рэгулярна зьбіраецца для багаслужэньняў, не зарэгістравала свой Статут. У разглядзе гэтай справы камісыя выканкаму абапіралася на пратакол, які быў складзены ўчастковым міліцыянтам. Пастар І. Радкевіч адмовіўся падпісаць гэты пратакол і заявіў, што разгляд павінны адбывацца ў судовым парадку.

Ільля Радкевіч зьяўляецца пастарам Аб'яднаньня цэркваў Хрысьціянаў Веры Эвангельскай пас. Повіць Кобрынскага раёну Берасьцейскай вобласьці. Царква налічвае каля 50 вернікаў.

## У Берасьці арыштаваны веруючыя эванельскіх цэркваў гораду, удзельнікі флэш-мобу «Вахта маўчаньня» у падтрымку беларускіх палітзьняволеных

Акцыяй маўклівага чытаньня Бібліі эвангельскія хрысьціяне г. Бярэсьця выказалі салідарнасьць з усімі беларускімі палітзьняволе-



*Удзельнікі флэш-мобу «Вахта маўчаньня» чытаюць Біблію на цэнтральнай плошчы г. Берасьця*

нымі, а таксама з 36 актывістамі «Маладога Фронту», якія абвесьцілі галадоўку пратэсту. Каля дзесяці чалавек — веруючых пратэстанцкіх цэркваў — прынялі ўдзел у «Вахце маўчаньня». Удзельнікі «Вахты» вырашылі на працягу сутак моўчкі чытаць Біблію на пл. Леніна ў цэнтры Берасьця.

Раніцай **3 чэрвеня** міліцыя затрымала 5 пратэстантаў, якія былі дастаўленыя ў гарадзкі суд. Трое зь іх — Натальля Касьцюковіч, Юры Бакур і Юры Кліменка былі прызнаныя «віноўнымі ў парушэньні правілаў правядзеньня рэлігійных сабраньняў», і атрымалі папярэджаньне.

Адна з удзельніц акцыі «Вахта маўчаньня» Натальля Касьцюковіч заявіла, што падтрымка палітычных зьняволеных сёньня — гэта грамадзянскі абавязак беларускіх хрысьціянаў. «Пасьля вынікаў прэзідэнцкіх выбараў і падзеяў, якія адбываліся ў сакавіку ў Менску, людзі зь некалькіх пратэстанцкіх цэркваў Берасьця адчулі ў сваім сэрдцы памкненьне да малітвы і актыўнага дзеяньня дзеля пераменаў у Беларусі, — гаворыць Натальля. — Менавіта таму мы прынялі ўдзел у «Вахце маўчаньня».



## Судовае разбіральніцтва вернікаў царквы «Новае жыцьцё» г. Менска не спыняецца

Сутнасьць канфлікту — прызнаньне права на ўладаньне будынкам царквы па вул. Кавалёва, 72 г. Менску за рэлігійнай грамадой. На працягу амаль двух год улады ціснуць на царкву, вымушаючы вернікаў адмовіцца ад правоў на ўладаньне будынкам і імкнучыся прымусова выкупіць яго.

**22 чэрвеня** адбылося чарговае паседжаньне па справе, у якой царква «Новае жыцьцё» патрабуе ад Менгарвыканкаму аформіць дакумэнты на будынак па вул. Кавалёва, 72, як на культавы.

У судзе прынялі ўдзел прадстаўнік сталічнага выканкаму, а таксама начальнік упраўленьня генеральнай забудовы Камітэта архітэктуры і будаўніцтва Аляксей Вага. Паседжаньне было папярэднім, бакі выклалі сваё меркаваньне па гэтым пытаньні. У прыватнасьці прадстаўнік «Менскархітэктуры» паведаміў, што для разьмяшчэньня ў горадзе царквы павінна прымацца асобнае рашэньне Менгарвыканкаму. Юрыст «Новага жыцьця» Сяргей Луканін адзначыў, што «вернікі неаднаразова падавалі заявы з просьбай разьмясьціць царкву на якой-небудзь тэрыторыі ў Менску, аднак адказ на гэтыя просьбы быў адзін: да 2010 году ўсе ўчасткі зямлі пад культавыя будынкі ўжо разьмеркаваныя».

7 чэрвеня у адказ на допіс намесьніка старшыні Менгарвыканкаму М. С. Ціцянкова, пастар царквы «Новае жыцьцё» Вячаслаў Ганчарэнка накіраваў ліст старшыні выканкама Міхаілу Паўлаву. Пастар Ганча-



рэнка прапанаваў М. Паўлаву «неперадузята паглядзець на сытуацыю збоку і ўбачыць, што пераҗылі і адчулі вернікі царквы, хрысьціяне, жыхары Менску, якія апынуліся пад жорсткім ціскам гарадаскіх уладаў». У лісьце пастар распавядае, як паводле волі чыноўнікаў у сталіцы не знайшлося памяшканьня для царквы, якое можна было б узяць у арэнду, і таму вернікі былі вымушаныя зьбірацца па нядзелях пад адкрытым небам у любое надвор'е. А калі прыхаджане ўсё ж такі набылі ўласны будынак, улады аб'весьцілі там сабраньні незаконнымі. Напрыканцы пастар В. Ганчарэнка выказаў надзею, што канфлікт будзе пераадолены.

## Вернікі занепакоеныя прыняцьцём новага Закона «Аб агульнай сярэдняй адукацыі»

**16 чэрвеня** Савет Рэспублікі ўхваліў прыняцьцё новага Закону «Аб агульнай сярэдняй адукацыі». У траўні Закон падтрымалі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь. Зьмены, якія адрозьніваюць новы Закон ад папярэдняга, насьцярожылі прадстаўнікоў настаўніцкай супольнасьці, бацькоў, вернікаў розных дэнамінацыяў.

Паводле новага Закону істотна абмяжоўваюцца правы бацькоў — законных прадстаўнікоў дзіцяці — прадстаўляць інтарэсы сваіх дзяцей. У прыватнасьці, бацькі пазбаўляюцца права выбіраць форму адукацыйнага працэсу. Гэта значыць, што тыя сем'і, якія пажадаюць навучаць сваіх дзяцей па-за дзяржаўнай сыстэмай агульнай сярэдняй адукацыі, будуць пазбаўленыя такога права.

«Наколькі вядома, школа ў нас сьвецкая, а гэта значыць, што сьветапогляд і мараль, якія там выкладаюцца, таксама сьвецкія. А што рабіць тым бацькам, якія хочуць навучаць сваіх дзяцей паводле Біблii? — пытаецца Сьвятлана Сьветлая, пэдагог, спэцыяліст у галіне адукацыі. — Чаму бацькоў, якія маюць найвялікшую адказнасьць за дзяцей, пазбаўляюць права выбіраць, якім чынам вучыць сваё дзіця?»

Рух так званых дамашніх школаў у Беларусі толькі набірае моц. Веруючыя бацькі, занепакоеныя засільлем ідэалёгіі, несвабоды і ціску на дзяцей зь веруючых сем'яў у беларускіх школах, вучаць сваіх дзяцей дома. Да апошняга часу законы Рэспублікі Беларусь дазвалялі атрымоўваць адукацыю па-за школьнымі сьценамі і прадугледжвалі сыстэму ацэнкі ўзроўню ведаў такіх вучняў. Як правіла, дзеці з дамашніх школаў паказвалі вельмі высокі ўзровень ведаў. Ці захаваецца такая



магчымасьць і надалей? Адказ на гэтае пытаньне ўсё больш клапоціць беларускіх хрысьціянаў.

«Шэраг вельмі важных пытаньняў, зьвязаных з прыняцьцём новага Закону не былі вынесеныя на шырокае абмеркаваньне. Ніхто не спытаўся меркаваньня тых, каго Закон тычыцца ў першую чаргу — бацькоў і пэдагогаў, — кажа С. Сьветлая. — Там увесь час гаворыцца аб захаваньні псыхічнага і фізычнага здароўя нашых дзяцей, але ўмовы, у якія ставяцця дзеці, могуць ім толькі пашкодзіць».

## Пастара баранавіцкай царквы Саюза Хрысьціянаў Веры Эвангельскай аштрафавалі на 4 мільёны рублёў

**2 ліпеня** Сяргея Пазьняковіча, пастара баранавіцкай царквы пяцідзясятнікаў «Збаўленьне», за правядзеньне абраду масавага хрышчэньня Баранавіцкі суд аштрафаваў на чатыры мільёны рублёў. Прычынай судовага перасьледу стала тое, што на хрост не было дазвола мясцовых уладаў.



*Пастар Сяргей Пазьняковіч*

Рэлігійная супольнасьць «Збаўленьне» — самая буйная на Берасьцейшчыне. Яна налічвае каля 1500 вернікаў. Дазвол, згодна з законам, трэба браць у гарвыканкаме, бо хрост у вадзе разглядаецца ўладамі як правядзеньне вулічнага масавага мерапрыемства. Чыноўнікі не далі афіцыйнага дазволу, матывуючы гэта тым, што вада не адпавядае санітарным нормам. Але хрост адбыўся. Летась гарадзкія ўлады аштрафавалі пастара на 100 000 рублёў за несанкцыянаванае набажэнства.



*Царква «Збаўленьне», Баранавічы*

## Вярхоўны Суд пакінуў у сіле рашэньне аб ліквідацыі рэлігійнай супольнасьці «Запавет Хрыста»

Паседжаньне па гэтай справе адбылося **13 ліпеня**. «Запавет Хрыста» — рэлігійная супольнасьць, якая была ліквідаваная рашэньнем Менскага гарадзкога суда 6 траўня гэтага году. Вярхоўны Суд прызнаў рашэньне аб ліквідацыі правамоцным.

Афіцыйнай прычынай ліквідацыі стала тое, што юрыдычны адрас царквы не адпавядае новаму Закону аб грамадзкіх арганізацыях. У сакавіку гэтага году за правядзеньне несанкцыянаванага багаслужэння пастар царквы «Запавет Хрыста» Георгі Вязоўскі адбыў пакараньне 10 сутак арышту.

## Шматдзетныя бацькі, вернікі эвангельскіх цэркваў, і іх дзеці былі прымусова вывезеныя ўладамі з адпачынку ў в. Ціжышкі Смаргонскага раёну

Адпачынак, арганізаваны шматдзетнымі сем’ямі, праходзіў у в. Ціжышкі Смаргонскага раёна Гродзенскай вобл. на тэрыторыі і ў будынках, якія зьяўляюцца прыватнай уласнасьцю. Усяго на адпачынку знаходзіліся каля 60 чалавек, зь іх 45 дзяцей.

**9 жніўня** мясцовыя ўлады пры дапамозе 12 вайскоўцаў памежнай службы прымусовым чынам вывезьлі ўдзельнікаў адпачынку ў Менск.

Бацькі накіравалі скаргу ў Менгарвыканкам за гэтыя дзеянні. У адказе, падпісаным намесьнікам старшыні гарвыканкама М. С. Цыянковым гаворыцца, што «рашэньне аб спыненьні калектыўнага адпачынку на хутары было абумоўленае неабходнасьцю ліквідацыі прычын, якія пагражалі жыцьцю і здароўю дзяцей». Удзел супрацоўнікаў Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў тлумачыцца «прыналежнасьцю часткі бацькоў і дзяцей да рэлігійных абшчынаў Хрысьціянаў Поўнага Эвангельля і неабходнасьцю высьвятленьня абставінаў арганізацыі калектыўнага знаходжаньня на хутары». Пры гэтым у лісьце было напісана што, «паўнамоцтвы службовых асобаў перавышаныя не былі».



## Айцу Аляксандру Шрамку Эпархіяльная рада параіла не карыстацца інтэрнэтам



*а. Аляксандар Шрамко*

Эпархіяльная рада Беларускага Экзархату РПЦ пастанавіла параіць а. Аляксандру Шрамку кінуць дзейнасьць у інтэрнэце і засяродзіць свае высілкі беспасярэдне на пастырстве.

Прычына такога рашэньня ў тым, что а. Аляксандар пісаў публіцыстычныя артыкулы на актуальныя пытаньні царкоўнага жыцьця ў Беларусі і публікаваў іх на сайце «Царква» і ў «Жывым журнале».

Рэфэрэнт у сувязях з СМІ Беларускага Экзархату архімандрыт Аляксей (Шынкевіч), адзначае, што публікацыях а. Аляксандар Шрамко выказваў меркаваньні, якія «не адпавядаюць высокаму сану праваслаўнага сьвятара» і якія спрычыніліся да нэгатыўнай рэакцыі сярод праваслаўных інтэрнэт-карыстальнікаў.

Рашэньне было прынятае 15 верасьня на паседжаньні Эпархіяльнае рады пад старшыньствам мітрапаліта Менскага і Слуцкага Філарэта.

## Беларускія ўлады не працягнулі візы сямі ксяндзам і пяці сёстрам-законьніцам, што працавалі ў Гарадзенскай каталіцкай дыяцэзіі



*Касьцёл Сьв. Францыска Ксаверыя, Горадня*

**20 верасьня** стала вядома, што сямі ксяндзам і пяці сёстрам з Польшчы, якія працуюць на Гарадзеншчыне, беларускія ўлады адмовіліся працягнуць візы. Гарадзенскі біскуп Аляксандар Кашкевіч спрабаваў дамагчыся адмены гэтага рашэньня, але марна.

Да канца сьнежня ўсе гэтыя духоўныя асобы, якія зьяўляюца грамадзянамі Польшчы, павінны былі пакінуць тэрыторыю Беларусі.

Улады тлумачаць такое рашэньне патрэбай уладкаваць на вызваленыя месцы маладых сьвятароў і сясьцёр — беларускіх грамадзянаў. Прадстаўнікі Гарадзенскай дыяцэзіі гавораць, што касьцёл кіруецца ўласным правам, і толькі біскуп, а ня сьвецкія ўлады, вырашаюць, якога сьвятара і на якую пасаду прызначыць.

## Эвангельская царква «Новае жыцьцё»: «Мы патрабуем справядлівасьці!»

У 2002 годзе рэлігійная абшчына «Новае жыцьцё» набыла будынак кароўніка ў вёсцы Сухарава пад Менскам. За кароткі час вернікі правялі маштабныя працы па добраўпарадкаваньні тэрыторыі і прыстасаваньні будынку да сваіх патрэбаў. На багаслужэньні зьбіраецца ад 700 да 1000 чалавек.

У 2004 годзе тэрыторыя вёскі разам з маёмасьцю царквы ўвайшла ў межы горада. Гэта стала прычынай ціску гарадзкіх уладаў на царкву з мэтай ануляваць дамову аб куплі-продажы і прымусова выкупіць будынак у царквы. Судовы працэс па гэтай справе пачаўся 25 кастрычніка 2005 года.





## Пастар царквы «Новае жыцьцё» аштрафаваны на мільён рублёў



*Пастар Вячаслаў Ганчарэнка*

Маскоўскі суд г. Менска прыняў пастанову аштрафаваць пастара царквы «Новае жыцьцё» Вячаслава Ганчарэнка. Аб гэтым стала вядома ў пятніцу **4 жніўня** 2006 г. з пісьмовага апавяшчэньня, якое прыйшло ў офіс царквы. За арганізацыю несанкцыянаванага багаслужэньня 4 чэрвеня яму прад'явілі позву на выплату штрафу ў памеры 30 базавых велічыняў. Гэта складае амаль адзін мільён беларускіх рублёў.

Судовае паседжаньне адбылося без Вячаслава Ганчарэнкі. У гэты час ён знаходзіўся ў адпачынку за межамі нашай краіны.

## Суд пастанавіў пазбавіць будынка царкву «Новае жыцьцё»

**21 ліпеня** Менскі гарадзкі Гаспадарчы суд вынес рашэньне аб прымусовым выкупе будынка царквы «Новае жыцьцё», які знаходзіцца па адрасе вул. Кавалёва, 72. Будынак мае быць выкуплены ў 10-дзённы тэрмін за 37,5 млн рублёў (каля 17 тыс. даляраў). Рашэньне вынес Аляксандар Карамышаў, судзьдзя Гаспадарчага суда. Менгарвыканкам у судзе прадстаўляў Аляксандар Казятнікаў, галоўны спэцыяліст юрыдчнага аддзелу.

Прадстаўнікі царквы лічаць, што рашэньне аб выкупе не абгрунтаванае і ня мае ніякіх падставаў.

Чыноўнікі ацанілі будынак у 30—35 разоў таньней за яго сапраўдны кошт. Акрамя гэтага, суд абавязаў царкву яшчэ выплаціць 310 тыс. рублёў за выдаткі падчас судовага працэсу. 28 жніўня апэляцыйная інстанцыя Гаспадарчага суду г. Менска прызнала гэтае рашэньне законным. Пасьля пералічэньня грошаў на рахунак царквы, згодна з законам, вернікі ў 10-дзённы тэрмін павінны вызваліць будынак.

KAMUNIKAT.org

## 5 кастрычніка вернікі царквы «Новае жыцьцё» абвясьцілі пост-галадоўку. Беспрэцэдэнтная акцыя пратэсту доўжылася 23 дні

Нагодай для пачатку галадоўкі-паста стаў прымусовы выкуп будынка царквы «Новае жыцьцё». 29 верасьня гэтага года, паводле рашэньня Менскага гарадзкога Гаспадарчага суду (ад 21 ліпеня), грошы для прымусовага выкупу (каля 37,5 млн беларускіх рублёў) былі пералічаныя з рахунку Фонду Менгармаёмасьць на рахунак царквы «Новае жыцьцё». Пасьля гэтага вернікам было дадзена 10 дзён на тое, каб вызваліць будынак. Тэрмін мінуў 8 кастрычніка.

У адказ на гэтыя дзеяньні 5 кастрычніка, у чацвер, вернікі царквы «Новае жыцьцё» абвясьцілі галадоўку. Акцыю пачалі 16 чалавек, а ўжо 10 кастрычніка ў пасьце-галадоўцы знаходзіліся 132 чалавекі з усёй Беларусі.

Асноўныя патрабаваньні вернікаў:

**— адмяніць рашэньне Менгарвыканкама, паводле якога царква «Новае жыцьцё» пазбавілася зямлі і будынку,**

**— дазволіць перапрафіляваньне будынку царквы ў культавы.**





«Мы хочам праводзіць тут свае зборы і маліцца», — заявілі беларускія хрысьціяне. Падзеі вакол царквы «Новае жыцьцё» паднялі хвалю пратэсту сярод вернікаў. Падчас акцыі ў будынку царквы кругласуткава знаходзіліся каля 100 чалавек. Кожны дзень у будынку на Кавалёва, 72 праходзілі багаслужэньні, у якіх прымалі ўдзел грэка-каталікі, рымакаталікі, вернікі Расейскай Праваслаўнай Царквы, Апостальскай праваслаўнай царквы і пратэстанты розных дэнамінацыяў.

## Галадаючых адмовіліся аглядаць лекары



Лекары дзяржаўных паліклінік менскага мікраараёна Сухарава адмовіліся аглядаць галадаючых і параілі ім зьвяртацца ў хуткую дапамогу. За ўвесь час галадоўкі чатыры чалавекі патрапілі ў рэанімацыю. У многіх абвастрыліся хранічныя захворваньні, людзі трацілі прытомнасьць і скардзіліся на галаўны боль.

## Паклёпніцкі рэпартаж на СТБ

Новай прычынай судовага разбіральніцтва стаў візыт здымачнай групы тэлеканала СТБ на месца галадоўкі. У будынак журналістаў не пусьцілі, тым ня менш 14 і 15 кастрычніка ў этэры канала прайшлі паклёпніцкія рэпартажы пра царкву «Новае жыцьцё». У рэпартажы службоўцы Камітэта па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў агучвалі няпраўдзівую інфармацыю адносна царквы. У адказ на гэтыя заявы вернікі падалі скаргу ў Пракуратуру на СТБ і на журналістку Л. Джураеву — аўтара рэпартажу — і запатрабавалі абвергнуць ману.

8 снежня ў офіс царквы прыйшоў ліст з Упраўленьня ўнутраных справаў Адміністрацыі Цэнтральнага раёна г. Менска. У ім гаварылася, што царкве адмоўлена ва узбуджэньні крымінальнай справы ў дачыненьні да журналісткі Л. Джураевай і яе калегаў, «бо ў іх дзеяньнях адсутнічаюць прыкметы якога-небудзь злачынства».

KAMUNIKAT.org

## Мітынг у падтрымку царквы



**21 кастрычніка** на пл. Бангалор у Менску адбыўся мітынг у падтрымку царквы «Новае жыцьцё», у якім прынялі ўдзел каля 2 тыс. чалавек. На мітынгу з патрабаваньнямі аднавіць справядлівасьць выступілі пастары розных эвангельскіх дэнамінацыяў.

## Пастару Вячаславу Ганчарэнку пагражаюць штрафам у 6 мільёнаў рублёў

Царква «Новае жыцьцё» падала заяву ў Вышэйшы Гаспадарчы Суд у сувязі з рашэньнем Менгарвыканкама і Менскага гаспадарчага суду аб перадачы будынка царквы на баланс ЖРЭА Маскоўскага раёна Менску.

26 кастрычніка ў «Новае жыцьцё» прыйшоў ліст з Вышэйшага Гаспадарчага Суду, у якім паведамлялася, што пастар царквы Вячаслаў Ганчарэнка можа быць прыцягнуты да адказнасьці за невыкананьне пастановы суду і аштрафаваны на 200 базавых велічыняў (6 мільёнаў 200 тысячаў беларускіх рублёў).

## Аштрафаваная жонка ўдзельніка акцыі «Пост-галадоўка» Уладзіміра Мацкевіча Сьвятлана



*Сьвятлана Мацкевіч*

26 кастрычніка жонкі ўдзельнікаў галадоўкі разам зь дзецьмі паспрабавалі патрапіць на прыём да намесніка старшыні Менгарвыканкама М. Ціцянкова. Сваякі галадоўнікаў хацелі паразмаўляць з службоўцамі аб галадоўцы і пераканаць іх выканаць патрабаваньні ўдзельнікаў акцыі.



Жонку аднаго з удзельнікаў галадоўкі Ўладзімера Мацкевіча Сьвятлану гвалтам вывелі з будынку. У міліцэйскай машыне яе адвезьлі ў Маскоўскі РУУС г. Менска для высьвятленьня асобы. Суд адбыўся 27 кастрычніка ў Маскоўскім судзе г. Менска. С. Мацкевіч аштрафавалі на 5 базавых велічыняў (155 тыс. беларускіх рублёў).

## Улады г. Гомеля прасілі пастараў ня ўдзельнічаць у галадоўцы царквы «Новае жыцьцё»

Намесьнік галавы адміністрацыі па ідэалёгіі г. Гомеля ў тэлефонных гутарках з пастарамі поўнаэвангельскіх цэркваў горада прасіла іх не далучацца да акцыі пратэсту «Пост-галадоўка» ў падтрымку царквы «Новае жыцьцё». «Спасылаючыся на тое, што «гэта ня нашы праблемы і менскія ўлады самі разьбяруцца з гэтым пытаньнем», яна неадназначна дала зразумець, што калі мы будзем падтрымліваць акцыю «Новага жыцьця», то ў нас саміх пачнуцца праблемы», — паведаміў адзін з удзельнікаў сустрэчы.

## 28 кастрычніка акцыя «Пост-галадоўка» была прыпыненая




*Удзельнікі акцыі «Пост-галадоўка»*

У царкве «Новае жыцьцё» атрымалі ліст аб тым, што рашэньне Гаспадарчага суду адносна царквы апратэставана калегіяй Вышэйшага Гаспадарчага Суду. Гэтая навіна стала прычынай прыпыненьня акцыі. 27 лістапада стала вядома, што рашэньне, паводле якога рэлігійная грамада пазбавілася зямлі і будынку, адменена калегіяй Вышэйшага Гаспадарчага Суду. Аднак у будынку царквы па-ранейшаму заставаліся начаваць людзі, а кожны вечар праходзілі багаслужэньні.

## У дачыненьні да будынку царквы «Новае жыцьцё» зьдзейснены акт вандалізму

У ноч на **1 лістапада** ў дачыненьні да будынку царквы «Новае жыцьцё» быў зьдзейснены акт вандалізму. На сьцены быў нанесены надпіс «Таталітарным сэктам — не». Будынку была нанесеная матэрыяльная шкода. Вернікі зьвярнуліся ў міліцыю. 17 лістапада была атрыманыя адмова аб узбуджэньні крымінальнай справы, на чым настойвала абшчына, кіруючыся арт. 341 УК РБ «Апаганьваньне будынкаў і псаваньне маёмасьці».




## Адбылося першае паседжаньне Вышэйшага Гаспадарчага Суду ў справе царквы «Новае жыццё»

**22 снежня** адбылося першае паседжаньне Вышэйшага Гаспадарчага Суду, на якім разглядалася позва царквы «Новае жыццё» аб прызнаньні пазапраўным рашэньня Менгарвыканкама ад 17.08.2005 г. аб пазбаўленьні царквы права карыстаньня зямлёй з наступным прымусовым выкупам будынка.



## Польскага ксяндза Антонія Кочку аштрафавалі на 62 тыс. беларускіх рублёў і забаранілі служыць у Беларусі

Грамадзянін Польшчы 78-гадовы ксёндз Антоній Кочка быў аштрафаваны на 62 тыс. рублёў (дзьве базавыя велічыні) і зможа знаходзіцца ў Беларусі да канца тэрміна дзеяньня візы, не займаючыся рэлігійнай дзейнасьцю.

Супрацоўнікі міліцыі склалі на сьвятара два адміністрацыйныя пратаколы за парушэньні беларускага заканадаўства. Паводле дакумэнтаў, А. Кочка парушыў правілы знаходжаньня замежных грамадзянаў на тэрыторыі краіны, бо «не прайшоў абавязковую дзяржаўную рэгістрацыю пры ўезьдзе на тэрыторыю Беларусі». Па-другое, сьвятар праводзіў багаслужэньне ў касьцёле, ня маючы на гэта дазволу. У адпаведнасьці зь беларускім заканадаўствам замежныя сьвятары для занятку рэлігійнай дзейнасьцю павінны атрымаць дазвол Камітэта па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў пры Савеце Міністраў, якога ў А. Кочкі не было.

Ксяндзу, абвінавачанаму ў парушэньні часткі 1 артыкулу 185 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях («Парушэньне правілаў знаходжання замежных грамадзян у Рэспубліцы Беларусь»), пагражала пакараньне ў выглядзе папярэджаньня або штрафу да 20 базавых велічыняў.

Нагадаем, што А. Кочка нарадзіўся ў Берасьцейскім раёне Беларусі, дзе дагэтуль жывуць яго сваякі, і апошнія 15 гадоў служыў у вёсцы Замосьце Слуцкага раёну Менскай вобласці. Знаходзячыся праездам у Менску, ксёндз Антоній 22 верасьня адслужыў імшу ў Чырвоным касьцёле, пасля чаго быў затрыманы прадстаўнікамі праваахоўных органаў і аштрафаваны пасьля складаньня пратаколу.

## Беларускія каталікі зьвярнуліся да А. Лукашэнкі з просьбай не высылаць польскіх ксяндзоў

У **кастрычніку** вернікі Гарадзенскай дыяцэзіі Беларускай рымска-каталіцкай царквы зьвярнуліся з пасланьнем да Аляксандра Лукашэнкі. У ім утрымліваецца просьба вырашыць пытаньне аб падаўжэньні



*Аляксандар Кашкевіч, біскуп Гарадзенскай дыяцэзіі*

дазволу на працу на наступны год сямі польскім сьвятарам і пяці польскім манашкам.

Также в костелах г. Гродно и гродненской области начался сбор подписей за продление властями визы на следующий год ксендзу Ярославу Грынашкевичу, редактору католической газеты «Слово жизни».

Тем не менее семь ксендзов из Польши, которые служат в Гродненской диоцезии, не получили разрешения на продолжение работы в следующем году. Также разрешение не было дано пяти монахиням, гражданкам Польши.

По данным на октябрь 2006 года, в Гродненской диоцезии работает около 170 приходов, в которых служит около 70 священников из Польши. Из всех 354 католических священников в Беларуси 170 — иностранцы, в большинстве случаев поляки.

## В Бресте верующих «РПЦ Заграницей» заставляют отзывать свои подписи за регистрацию религиозной общины

В Бресте беларуские чиновники по соглашению с местными священниками Московского Патриархата оказывали давление на прихожан Русской Православной Церкви Заграницей с целью заставить их отозвать свои подписи с заявления о регистрации религиозной общины.

Частью процедуры регистрации является подписание как минимум 20 гражданами Беларуси заявления о намерении создать религиозную организацию, при этом они должны обозначить свое полное имя, адрес, дату рождения и поставить подпись.

Священники и прихожане православной церкви Московского Патриархата в Бресте пришли в квартиры тех, кто поставил свои подписи в заявлении о регистрации прихода РПЦЗ, и, по словам подписавшихся, вынуждали их отозвать свои подписи.

Русская Православная Церковь Заграницей, центр которой находится в США, разорвала отношения с Московским Патриархатом в 1927 году после того, как РПЦ приняла декларацию о лояльном отношении к Советскому Союзу.

## Неизвестные осквернили вывеску протестанской церкви «Спасение» в Барановичах

В ночь с **10 на 11 октября** был совершен акт вандализма в отношении церкви «Спасение» (Союз Христиан Веры Евангельской) в Барановичах.

Вандалы черной краской написали «Не верь сектам» и забросали камнями и пустыми бутылками вывеску размером 5 на 2,5 м (это информационный бигборд с адресом и телефоном религиозной общины) на пересечении улиц Тельмана и Першукевича. Прихожане церкви обратились в милицию.




*Оскверненная вывеска церкви «Спасение» Союза ХВЕ, г. Барановичи*

## На пастора в Крупках составили протокол за поддержку минской церкви «Новая жизнь»

**30 октября** пастора церкви Христиан Веры Евангельской в г. Крупки Минской обл. Николая Боричевского вызвали в РОВД и составили протокол за проживание в городе без прописки. Николай Боричевский прописан в Минске, однако с 1997 г. живет в Крупках, где несет служение пастора.



Пастор Боричевский считает, что такое внимание правоохранительных органов вызвано высказываниями пастора в поддержку акции протеста в минской церкви «Новая жизнь». 23 ноября, по словам пастора, его вызывали в райисполком и требовали разъяснить позицию по отношению к властям, демонстрируя в его отношении документы из КГБ Минской области.

## 1 декабря голодовку объявили прихожане католического прихода Девы Марии Остробрамской, Матери Милосердия в Гродно



*кс. Александр Шемет*

**1 декабря** впервые за историю беларуской Католической Церкви верующие во главе с ксендзом Александром Шеметом, настоятелем прихода Девы Марии Остробрамской, Матери Милосердия в Гродно, объявили голодовку. За неделю до этого католики провели акцию протеста перед зданием Гродненского исполкома, в которой приняло участие около 100 человек.

С 1997 года верующие не могут получить разрешение на строительство костела. Под строительство был выделен участок, однако разрешение, чтобы начать работу, христиане так и не получили. Прихожане не один раз обращались к властям, но никакого результата это не принесло. Приход находится в густонаселенном районе города и насчитывает около 5 тыс. человек. Службы проходили в часовне на 100 человек.

Пост-голодовку начали 10 человек. Акцию поддержал епископ гродненской диоцезии Александр Кашкевич. Чиновники некоторое время игнорировали голодовку, но на шестой день стало известно, что власти дали разрешение на строительство храма. 6 декабря ксендз Александр и 16 участников акции начали выход из голодовки.

«Искра, которая загорелась в Минске во время голодовки протеста в защиту церкви «Новая жизнь» Объединения общин Полного Евангелия, зажглась и в Гродно и победила в битве с несправедливостью. Однако это не конец борьбы с ущемлением прав христианской Церкви», — сказал в одном из интервью ксендз А. Шемет.

KAMUNIKAT.org

## Неизвестные подожгли здание православной церкви в Мозыре

**25 декабря** неизвестные подожгли деревянную церковь Святого Георгия Победоносца в Мозыре. Спасатели, прибывшие на место пожара, не смогли спасти здание. Для поджога преступники использовали дизельное топливо, которым облили углы внутри храма. В результате церковь была полностью уничтожена огнем.

На стенах здания поджигатели выгравировали надписи сатанинского содержания. По факту поджога было возбуждено уголовное дело.

Это уже второй случай поджога православного храма в Мозыре. Полтора месяца тому назад попытка поджога была пресечена.

## 29 декабря бессрочную голодовку объявили верующие католического костела в д. Лаздуны Ивьевского района Гродненской области

Протест поддержал соседний приход в д. Юратишки. В голодовке приняло участие более 100 верующих.

Первыми бессрочную голодовку объявили верующие Вероника Скляпович, Янина Карпинская и Янина Сильванович (все пенсионного возраста). Они требовали у властей продлить визу настоятелю их прихода, гражданину Польши, ксендзу Мариушу Ильяшевичу. Около 100 человек из соседней с Лаздунами деревни Юратишки присоединились к акции протеста соседей, поддержав их требования.

Беларуские власти не дали священнику разрешения служить в беларуском костеле, ссылаясь на то, что в Беларуси без работы остаются выпускники местных католических семинарий.

Ксендз М. Ильяшевич служил в Беларуси 13 лет. Он помог отстроить костел в Лаздунах и помогал возводить храм в Юратишках. Его мать — беларуска, родом из Чашников, а отец освобождал Беларусь от фашистов. Верующие не добились для него разрешения властей, и 31 декабря ксендз Мариуш Ильяшевич был вынужден уехать из Беларуси.

# Дадатак

лісты, дакумэнты, заявы, звароты

KAMUNIKAT.org

## Будзем маліцца за Беларусь!

*У сакавіку 2006 г. шэраг хрысьціянскіх і грамадзкіх лідэраў выступілі зь ініцыятывай супольнай малітвы за Беларусь. Яны заклікалі разглядаць кожную пятніцу як дзень усеагульнага зьмірэньня, паста і малітвы. «У гэты дзень, штопятніцы, а 20:00 вечара зьвернем нашыя сэрцы да Магутнага Бога і ў адзінстве ўзьнясем малітвы аб міласьці і ласцы для нашай нацыі», — гаворыцца ў Звароце, тэкст якога мы прыводзім ніжэй.*

Мы зьвяртаемся да вас, хрысьціяне: праваслаўныя, каталікі, эвангельскія хрысьціяне, а таксама ўсе людзі добрага сумленьня. У сёньняшні час, няпросты для Беларусі, нам трэба аб'яднацца для паста і малітвы, каб прасіць Божай міласьці для аздараўленьня нашай нацыі.

Час сапраўды складаны. «І суд адступіў назад, і праўда стала здалёку, бо ісьціна спатыкнулася на плошчы, і сумленнасьць ня можа ўвайсьці. І ня стала ісьціны, і той, хто бяжыць ад зла, падпадае пад зьнявагу. І Госпад убачыў гэта, і агідна было вачам Яго, што няма суду» (Ісая 59:14—16).

Лік разводаў перавышае лік шлюбаў, кожнае чацьвертае дзіця нараджаецца па-за шлюбам, амаль кожны трэці мужчына схільны да алькагалізму, у адносінах паміж людзьмі пануюць злоба, хамства і хлусьня. Многія хрысьціянскія сьвятыні зьняважаныя, а хрысьціянаў караюць за малітву ля іх сьценаў. Цемра атэізму, нэапаганства, бязглуздага спажывецтва і агрэсіўнага эгаізму ахутала краіну.

Аднак, «шмат можа ўзмоцненая малітва праведнага» (Якуба 5:16). Менавіта Госпад, сапраўдны Творца гісторыі, можа даць Сваю, так неабходную нам дапамогу, калі знойдуцца верныя, гатовыя стаць цьвёрда ў малітве за сваю краіну.

Для гэтага давайце разглядаць кожную пятніцу як дзень усеагульнага зьмірэньня, паста і малітвы.

У гэты дзень, штопятніцы, а 20:00 вечара зьвернем нашыя сэрцы да Магутнага Бога і ў адзінстве ўзьнясем малітвы аб міласьці і ласцы для нашай нацыі. Прадметам нашых асаблівых, найбольш старанных малітваў мусяць стаць просьбы аб тым, каб праўда і справядлівасьць узялі верх на нашай зямлі, а ўсялякае беззаконьне было асаромлена.

Нашае грамадзтва стамілася ад бязьвер'я, абыякавасьці і страху. Мы хочам, каб стандартам чалавечых узаемадачыненьняў — ад найвышэйшых уладаў да самых бедных і непрыкметных грамадзянаў — стала



ўзаемная павага, еднасьць у Духу Сьвятым, а арыенцірам — Дзесяць Прыказаньняў Божых, правераных часам і гісторыяй.

Таму мы прапануем усім людзям, вернікам розных канфэсіяў, праводзіць гэты дзень згодна з прынятымі формамі іх веравызнаньня, каб аб'яднаная наша малітва была пачутая Госпадам і прынесла дабраслаўеньне, ісьціну і свабоду ў нашу краіну.

Як напісана ў Слове Божым: «І зьмірыцца народ Мой, які называецца імем Маім, і будуць маліцца, і пачнуць шукаць аблічча Майго, і зьвернуць з кепскіх шляхоў сваіх... то Я пачую з нябёсаў і прабачу грахі іхныя, і аздараўлю зямлю іх» (2 Кніга Хронік 7:14).

**айцец Ян Майсейчык**, грэка-каталік
**пастар Эрнэст Сабіла**, эвангельскі хрысьціянін
**прапаведнік Юры Сьмірноў**, эвангельскі хрысьціянін
**пастар Андрэй Сідар**, эвангельскі хрысьціянін
**бр. Аляксандар Пісарук (OFM)**, каталік
**бр. Пётра Рудкоўскі (OP)**, каталік
**бр. Апалінарый Нікалаеў (манах-рэдэмптарыст CSSR)**, грэка-каталік
**бр. Зьміцер Чарнель (манах-рэдэмптарыст CSSR)**, грэка-каталік
**айцец Ігар Лабацэвіч**, грэка-каталік

*Усяго — каля 350 подпісаў.*
*(Сайт ініцыятывы: www.zabelarus.info)*

## Пресвитерский Совет церквей Евангельских Христиан Баптистов Брестской области выразил свою обеспокоенность арестом пастора Вязовского

10 марта 2006 года состоялся Пресвитерский Совет церквей ЕХБ Брестской области, на котором обсуждались вопросы дальнейшей жизни и служения церквей. В заключение Совета был затронут вопрос ареста пресвитера автономной церкви ЕХБ Георгия Вязовского в г. Минске. Члены Совета решили направить письмо в Администрацию Президента Республики Беларусь, Генеральному Прокурору Республики Беларусь, Парламенту Республики Беларусь, Председателю Комитета по делам

религий и национальностей при Совете Министров Республики Беларусь следующего содержания:

«3 марта 2006 года состоялся суд над пресвитером Минской церкви ЕХБ «Завет Христа» Георгием Вязовским за проведение молитвенного собрания и изучения Библии (3-й главы Евангелия от Марка). Суд Партизанского района г. Минска обвинил Георгия Вязовского в нарушении статьи 167/1 административного кодекса РБ и подверг его аресту на 10 суток.

Это событие вызывает тревогу, глубокую обеспокоенность и говорит нам о преследовании наших единоверцев за распространение своих взглядов и убеждений в Республике Беларусь. Данный факт свидетельствует о нарушении прав и свобод, гарантированных Конституцией Республики Беларусь. Настоящее действие способствует разжиганию религиозной нетерпимости и неприязни, что запрещено законом Республики Беларусь «О свободе совести и религиозных организациях».

Арест и содержание под стражей в течение 10 суток священнослужителя Георгия Вязовского за распространение христианского учения и нравственных ценностей, является позором в области прав и гражданских свобод в Республике Беларусь. Надеемся, что здравый смысл и житейская мудрость в правовой оценке данного события со стороны органов государственной власти будет справедливой и объективной и подобное не повторится».

*Члены Пресвитерского Совета*

## Открытое обращение Объединения Общин Христиан Полного Евангелия по поводу ареста пастора Георгия Вязовского

В 2002 году Религиозное Объединение Общин Христиан Полного Евангелия в Республике Беларусь обращалось в Национальное Собрание Республики Беларусь, выражая свою обеспокоенность противоречиями статье закона «О свободе совести и религиозных организациях» с Конституцией РБ и Международным правовым актом о гражданских и политических правах граждан РБ. При этом были получены заверения соответствующих органов власти, что данный Закон не будет ограничивать уже зарегистрированные религиозные организации, направленность Закона на ограничение влияния деструктивных сект в обществе.



К сожалению, действительность сегодняшнего времени подтверждает наши наихудшие опасения

Религиозное Объединение Общин Христиан Полного Евангелия в Республике Беларусь выражает озабоченность фактом привлечения к административной ответственности (административному аресту на 10 суток) пастора религиозной общины «Церковь Евангельских христиан баптистов «Завет Христа» Вязовского Георгия Владимировича.

Правоохранительные и судебные органы усмотрели нарушение законодательства со стороны пастора Вязовского Г. В. в том, что группа верующих граждан без разрешения органов исполнительной власти собралась в его частном жилом доме для молитвы и изучения Библии.

Статья 31 Конституции Республики Беларусь предусматривает, что каждый имеет право самостоятельно определять свое отношение к религии, единолично или совместно с другими исповедовать любую религию или не исповедовать никакой, выражать и распространять убеждения, связанные с отношением к религии, участвовать в отправлении религиозных культов, ритуалов, обрядов, не запрещенных законом.

В соответствии со ст. 18 Международного пакта о гражданских и политических правах и ст. 23 Конституции Республики Беларусь ограничение прав и свобод личности, в том числе и права на свободу вероисповедания, допускается только в интересах общественной безопасности, порядка, защиты нравственности, здоровья населения, прав и свобод других лиц.

Какую же общественную опасность и для кого представляют верующие граждане, собравшиеся для совместного исповедания религии? Можно ли говорить о соблюдении конституционных прав граждан, если за совместную молитву и изучение Библии их привлекают к ответственности?

Мы молимся за нашего брата пастора Георгия Вязовского и призываем государственные органы проявлять благоразумие, мудрость и здравомыслие в вопросах свободы вероисповедания.

*Совет Епископов РООХПЕ в РБ*

## Зварот каталіцкіх манахаў з нагоды падзеяў сакавіка-2006

Мы, група каталіцкіх манахаў, ад свайго імя хочам звярнуцца да палітыкаў і ўсіх людзей добрай волі з нагоды апошніх падзей у Беларусі.

«І суд адступіў назад, і праўда стала здалёку, бо ісціна спатыкнулася на плошчы, і сумленнасць не можа ўвайсці. І ня стала ісціны, і той, хто бяжыць ад зла, падпадае пад знявагу. І Госпад убачыў гэта, і агідна было вачам Яго, што няма суду, што няма заступніка» (Ісая, 59:14—16).

Як хрысціяне мы верым, што цяперашні прэзідэнт можа мець сваю ўладу з Божай волі, аднак мы не верым, што з Божай воляй суадносяцца таксама хлусня, запалохванні, гвалт і пераследаванні, што адбываюцца ў Беларусі. Як хрысціяне мы вызнаем дзяржаўную ўладу, але як хрысціяне мы таксама не можам не рэагаваць на грэх. Мы жадаем і молімся, каб над нашай краінай і народам споўнілася Божая воля. Але яна не можа споўніцца ва ўмовах, калі нішчыцца свабода чалавека, якую Сам Творца паважае і ніколі не парушае, пакідаючы нам вольны выбар, так што нават даў людзям распяць Свайго Сына; ва ўмовах, калі людзі не маюць магчымасці свабодна прыняць Божую волю з-за таго, што хтосьці пакланяецца ідалу Ўлады.

Таму і звяртаемся да ўсіх, а асабліва да палітыкаў, не называючы па зразумелых прычынах сябе. Мы хочам выказаць свой погляд на шлях, якім трэба ісці да свабоды, і просім прыслухацца да нашага меркавання. Шлях нам бачыцца толькі адзін — у звароце да Госпада: «Пагляньце на даўнія роды і пабачце: хто верыў Госпаду — і быў засаромлены? або хто перабываў у страху Яго — і быў пакінуты? або хто клікаў да Яго, і Ён не глянуў на яго... аддадзімся ж у рукі Госпада, а не ў рукі людзей; бо якая веліч Яго, такая і міласць» (Сір. 2:10, 18). Няма шанцаў чагосьці дамагчыся без Бога. Госпад звяртаецца да нас:

«Май надзею на Госпада, будзь мужны; і хай мацуецца сэрца тваё, май надзею на Госпада» (Пс. 27:14). «Даручы Госпаду дзеі твае, і намеры твае зьдзейсьняцца» (Прып. 16:3). Вось жа што мы прапануем для перамогі.

Найперш трэба прасіць Госпада пра дапамогу. І будзьма ўпэўненыя, што нашыя просьбы будуць пачутыя. «Вось, рука Госпада не пакарацела, каб ратаваць, і вуха Яго не ацяжэла, каб чуць. А беззаконні вашыя зрабілі падзел паміж вамі і Богам вашым, і грахі вашыя адварочваюць аблічча Яго ад вас, каб не чуць» (Іс. 59:1, 2).

З просьбаю пра дапамогу цесна звязанае нашае асабістае навяртанне да Бога. «Калі вы будзеце рабіць паводле пастаноў Маіх і запаведзі Мае будзеце шанаваць і выконваць іх... пашлю мір на зямлю... і праганяцьмеце ворагаў вашых... пяцёра з вас прагоняць сто, і сто з вас прагоняць дзесяць тысяч...» (Ляв. 26: 3, 6—12). «На многае здольная шчырая малітва праведніка» (Як. 5:16).



Мусім пакорліва спадзявацца на Бога. Не павінны пакладаць надзею на свае сілы, не можам быць упэўненымі, што самі зможам усё зрабіць. Цяпер маем плады сваіх дзеянняў. Прыйшоў час сказаць: «Госпадзе, Ты бачыш, што мы самі не здольныя штосьці зрабіць, дапамажы Ты нам!» Даверымся нашаму Айцу! Будзем усе поспехі звязваць з Яго сілаю і праслаўляць Бога за ўсё, што атрымаецца дасягнуць, нічога не прыпісваючы сабе. «Спадзявайся на Госпада ўсім сэрцам тваім і не кладзі надзеі на розум твой. На ўсіх дарогах тваіх спазнавай Яго, і Ён выпрастуе шляхі твае. Ня будзь мудрацом у вачах тваіх; бойся Госпада, і пазбягай ліха» (Прып. 3:5—7).

Для таго, каб Бог атрымаў магчымасць дзейнічаць, нам трэба адчыніць дзверы любові. Прабачым ад душы ўсе крыўды, пакінем думкі пра помсту. І будзем маліцца за нашых ворагаў па словах Хрыста: «А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых, дабраслаўляйце кляцьбітоў вашых, рабеце дабро ненавіснікам вашым і маліцеся за крыўдзіцеляў вашых і за ганіцеляў вашых; каб сталіся вы сынамі Айца вашага, Які ёсць у нябёсах; бо Ён загадвае сонцу Свайму ўзыходзіць над ліхімі і добрымі і пасылае дождж на праведных і няправедных» (Мацв. 5:44, 45).

І апошняе — гэта святасць намеру. Мэта пераменаў павінна быць сугучнаю з Божаю справаю збаўлення чалавецтва, каб тое новае не аказалася горшым за гэтае старое. Не можа Бог дапусціць замену зла на яшчэ большае зло. Ліберальная свабода Захаду наўрад ці можа ў Божых вачах стаць альтэрнатываю дыктатуры. «Бо толькі Я ведаю намеры, якія маю пра вас, кажа Гасподзь, намеры на дабро, а не на ліха, каб даць вам будучыню і надзею. І ўсклікнеце Мне, і пойдзіце і памоліцеся Мне, і Я пачую вас; і пашукаеце Мяне і знойдзіце, калі пашукаеце Мяне ўсім сэрцам вашым» (Ер. 29:11—13).

Калі мы будзем гэтага прытрымлівацца, плады пабачым нашмат раней, чым можна сабе ўявіць. Ахвяруем жа Госпаду за нашую Радзіму свае чыстыя сэрцы! Звернемся да штодзённай малітвы раніцай і вечарам, да ўдзелу ў Службе Божай, да посту ў вызначаныя дні, да справаў міласэрнасці, да чытання Святога Пісання. Так мы станем справядлівымі ў Божых вачах, а «сэрцам ўпакораным і зміраным Бог не пагарджае» (Пс. 50:19). І калі Госпад аб'явіць нам сваю славу праз Свае дзеі, асцерагаймася, каб гэтую славу хто-небудзь з нас не запісаў на свой рахунак, каб не пра нас было сказана: «Бо яны народ, які страціў розум, і няма ў іх сэнсу. О, калі б яны памеркавалі, падумалі пра гэта, уразумелі, што з імі будзе! як бы мог адзін пераследаваць тысячу і двое прагнаць цемру, калі б Скала іхняя не выдаў іх, і Гасподзь не аддаў іх!» (Друг. 32:28—30).

Першыя ж плады нашых малітваў ужо прысутныя. Як сказаў адзін з замежных каталіцкіх біскупаў, гаворачы пра Беларусь: «Гэтыя людзі ўжо свабодныя. Гэта была іх перамога, якую можна параўнаць з Вялікаю Пятніцаю Ісуса Хрыста. «Бацька» яшчэ не ведае, што ён ужо не мае ўлады над імі». Так, як на крыві мучанікаў паўстала Царква, так на пераследаваннях паўстане Свабода. «Не марудзіць Гасподзь з выкананнем абяцання, як некаторыя лічаць гэта марудлівасцю; а доўга трывае нас, не хочучы, каб хто загінуў, а каб усе прыйшлі да каяння» (2 Пт. 3:9).

Памятайма таксама пра тое, што нават нацыянальныя сімвалы Беларусі клічуць нас да Бога — гімн «Магутны Божа», бел-чырвона-белы сцяг, колеры якога сімвалізуюць святасць і любоў, і герб «Пагоня» з крыжам св. Ефрасінні, які нам нагадвае св. Казіміра, або св. Юрыя, або і Само Слова Божае (Ісуса Хрыста), якое ў Апакаліпсісе падаецца ў выглядзе белага вершніка з мячом (Адкр. 19:11). Ды і галоўнае нацыянальнае свята — Дзень Волі — якраз супадае з Дабравешчаннем Найсвятой Багародзіцы. Таму будзем працягваць нашыя малітвы, пашыраючы і паглыбляючы іх!

Найсвятая Багародзіца, св. Ефрасіння, св. Язафат, св. Казімір і ўсе святыя заступнікі беларускага народу, маліце Бога за нас!

## Заявление церкви «Новая жизнь» в связи в началом акции «Пост-голодовка»

В 2002 г. церковь «Новая жизнь» на законном основании приобрела здание по адресу г. Минск, ул. Ковалева, 72 общей площадью 1641 кв. метр.

17 августа 2005 г. Мингорисполком принял решение № 1391, которым церковь была лишена права пользования земельным участком с последующим принудительным выкупом здания церкви.

29 сентября 2006 г. фондом Мингоримущество были перечислены деньги в сумме 37,5 млн руб. на банковский счет церкви. После этого было дано 10 дней на освобождение здания. Этот срок истекает 8 октября. Начиная с 9 октября, Мингорисполком может потребовать передачи здания.

Для исполнения своих незаконных решений Мингорисполком использовал Хозяйственный суд г. Минска. Мы не согласны с действиями Мингорисполкома и продолжаем опротестовывать их в установленном законодательством порядке.



Помимо этого, мы начинаем акции протеста, поскольку правда на нашей стороне.

С четверга, 5 октября, началась пост-голодовка с целью привлечь общественное внимание к нашей проблеме. К этой акции начинают присоединяться верующие других церквей.

Каждый вечер в 19:00 здесь, в здании церкви, будут проходить общие молитвенные служения, на которых будут присутствовать христиане Беларуси.

Также на 21 октября подана заявка на проведение митинга протеста на площади Бангалор.

**Всеми этими действиями мы хотим только одного: восстановить справедливость. Наши требования заключаются в следующем:**

1) **отменить решение Мингорисполкома о лишении церкви земли и здания;**
2) **разрешить перепрофилирование здания церкви в культовое.**

Мы надеемся на благоразумие Мингорисполкома и на принятие с его стороны справедливых решений.

Если Мингорисполком будет продолжать игнорировать наши требования или начнет действовать агрессивно, мы оставляем за собой право несанкционированных публичных выступлений.

*6 октября 2006 г.*

## «Война с протестантами»

***Заявление Ивана Пашкевича, советника председателя Союза Евангельских Христиан Баптистов Беларуси***

Правовой беспредел чинят все структуры государственной власти по отношению к церкви евангельских христиан «Новая жизнь». И минская городская власть, и Высший Хозяйственный Суд, и Администрация Президента вышли не только за пределы действующего законодательства, но и перешагнули статьи белорусской Конституции. Церковь, организованная по закону, преобредшая здание по закону, действующая в рамках закона, по вине власти оказалась вдруг вне закона. Отнят молитвенный дом, отняты средства, вложенные на его ремонт, отнято право на евангельское служение. Государство во главе с Лукашенко запретило тысяче верующих собираться вместе для молитвы и чтения Библии.

Лукашенко в открытую повел войну против протестантской церкви в Беларуси. Аресты проповедников и пастырей, наложение на служителей церкви непосильных штрафов, закрытие молитвенных домов, отказ в регистрации новых церквей — вот набор военных средств «православного атеиста» в отношении евангельских христиан. За его двенадцатилетнюю президентскую деятельность ни одна евангельская церковь, в том числе и католическая, не получила в Минске ни одного земельного участка и разрешения на строительство церкви.

Сотни молитвенных домов не могут зарегистрироваться как культовые здания, а значит верующие не могут собираться для прославления Господа. Как и в советские времена, сотрудники КГБ ведут слежку за церковными работниками, бесцеремонно приглашают их на беседы в свои кабинеты.

«Православный атеист», как себя называет А. Лукашенко, войну с верующими ведет в открытую, игнорируя протестную реакцию даже международных структур. Пользуясь неограниченной властью и безнаказанностью, он начал очередную расправу с церковью, членами которой являются более тысячи верующих. Ученик Лукашенко достоин своих безбожных учителей Ленина-Сталина, которые так же бульдозерами сносили храмы и отправляли в тюрьмы людей только за то, что они верили в Бога.

Часть евангельских христиан из церкви «Новая жизнь» объявили голодовку. Таким образом они хотят привлечь внимание общественности к безбожным, антиконституционным действиям властей.

К сожалению, впереди их ждут еще большие трудности. Очень хорошо зная характер Лукашенко, следует ожидать арестов голодающих, применения против них сил ОМОНа, избиений, не удивлюсь, если спецтехника разрушит здание молитвенного дома, как это было недавно в отношении автокефальной православной церкви.

Библия учит, что христиане бывают иногда притесняемы, но и в этом случае не стеснены, находятся в отчаянных обстоятельствах, но не отчаиваются, бывают гонимы, но не оставлены, бывают низлагаемы, но не погибают (2 Кор. 4:8). Мы знаем, что впереди у Лукашенко и таких как он сам, мирской суд и суд Божий. Но мы как истинные христиане не жаждем крови, а молимся за него и подобных Лукашенко и просим: «Прости их, Боже, ибо не ведают, что творят».

*Иван Пашкевич,*
*Советник председателя*
*Союза Евангельских Христиан Баптистов*



## Калектыўны зварот да вернікаў і душапастыраў усіх рэлігійных аб’яднанняў Беларусі

***прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці краіны з нагоды падзеяў вакол царквы «Новае жыцьцё»***

Любыя ў Госпадзе браты і сёстры! Мы, прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці краіны, звяртаемся да Вас з просьбай пачуць голас гнаных вернікаў царквы «Новае жыццё», якіх пазбаўляюць іхнага храма.

Цягам апошніх гадоў у Беларусі нарастае непаразуменне паміж уладамі і рэлігійнымі арганізацыямі. Шматлікія канфліктыня сітуацыі пагражаюць грамадзянскаму міру і стабільнасці ў грамадстве.

Просім Вас выказаць Вашу салідарнасць з вернікамі «Новага жыцця» ў іх законных патрабаваннях і дапамагчы абараніць правы на свабоду веравызнання.

Просім Вас давесці сваю пазіцыю да ведама ўладаў і сваіх супольнасцяў.

*30 кастрычніка 2006*

## Заява МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» ў падтрымку царквы «Новае жыццё»

МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» выказвае глыбокую заклапочанасць і разуменне праблем, якія вымушана паўсталі перад мінскай пратэстанцкай царквой «Новае жыццё» Аб’яднання суполак Хрысціян Поўнага Евангелля ў Рэспубліцы Беларусь.

Нежаданне мясцовых уладаў (Менгарвыканкама) надаць культавы статус будынку царквы (м-н Сухарава, вул. Кавалёва, 72), захады па фактычнай экспрапрыяцыі будынку і зямельнага надзелу вакол яго носяць гвалтоўны і несправядлівы характар. Усё гэта яскрава нагадвае адрынутыя гісторыяй ленінска-сталінскае ды хрушчоўскае «змаганні з рэлігіяй» і патыхае палітыкай «ваяўнічага атэізму». І ў той жа час на высокім дзяржаўным узроўні гучаць запэўніванні ў зацікаўленасці і гатоўнасці ўлады да плённага супрацоўніцтва з рэлігійнымі сацыяльнымі інстытутамі. Як гэта разумець?!

Сябры Згуртавання салідарызуюцца з сотнямі вернікаў, якія здзяйсняюць духоўны подзвіг у імя Госпада, шляхам галадоўкі пратэстуючы супраць беззаконня і парушэння сваіх грамадзянскіх і рэлігійных правоў. Трагізм сітуацыі заключаецца ў тым, што нават такая ахвярнасць доўгі час застаецца па-за ўвагаю абыякавага чынавенства. Аб якой жа духоўнасці і вышэйшай справядлівасці сучаснага беларускага ладу можна казаць?!

Статутнай мэтай дзейнасці МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» з'яўляецца якраз яднанне і кансалідацыя беларусаў незалежна ад іх палітычных поглядаў і рэлігійных перакананняў. Прадстаўнікі беларускай дыяспары жывуць у краінах свету з самымі рознымі дамінуючымі веравызнаннямі, у тым ліку з пераважна пратэстанцкім насельніцтвам. Зразумела, што такія неабачлівыя крокі з боку гарадской улады ў адносінах да вернікаў царквы «Новае жыццё» самым негатыўным чынам адбіваюцца на прэстыжы Рэспублікі Беларусь у міжнародным супольніцтве і ўскосна закранаюць інтарэсы замежных беларускіх зямляцтваў.

З часоў беларускай дзяржавы Вялікага княства Літоўскага, у якім прынцып рэлігійнай верацярпімасці быў замацаваны ў спецыяльных артыкулах знакамітага айчыннага Статута ВКЛ 1588 г., для беларусаў як нацыі характэрныя канфесійная талерантнасць, духоўнасць і спагада ў вырашэнні грамадскіх і жыццёвых спраў.

Вось чаму МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» звяртаецца да ўсіх зацікаўленых афіцыйных асобаў і грамадскіх структур з просьбай як мага найхутчэй вырашыць узніклы канфлікт з улікам пажаданняў вернікаў і надалей пазбягаць падобных інцыдэнтаў на рэлігійнай глебе. Гэта не толькі дапаможа захоўваць сацыяльны спакой у беларускім грамадстве, але і будзе спрыяць годнаму пачуванню суверэннай і незалежнай Рэспублікі Беларусь у сусветнай цывілізацыйнай прасторы XXI стагоддзя.

*Управа*
*МГА «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»*
*24.10.2006 г.*



## Зварот Біскупа Гродзенскага Аляксандра Кашкевіча ў сувязі з выдаленнем каталіцкіх святароў

*11 снежня 2006*

Паважаныя Браты ў святарстве, дарагія Сёстры-законніцы, Узлюбленыя Дыцэзіяне!

Існуючая сітуацыя прадыктавала мне напачатку кастрычніка звярнуца да вас з просьбай маліцца ў інтэнцыі святароў сясцёр-законніц, якія працуюць у нашай Дыяцэзіі. Гэта было выклікана адмовай з боку прадстаўнікоў дзяржаўнай улады даць дазвол на працу для 7 святароў і 5 законных сясцёр з Польшчы у 2007 г.

Дзякую вам за сведчанне малітоўнага адзінства і дзейснага клопату пра вашых пастыраў. Аднак надалей патрэбна падтрымка з вашага боку, асабліва ў бягучы момант, памятаючы пра тое, што мы складаем адно ў Хрысце. Я звяртаюся да вас у сувязі з лістом, атрыманым 2 снежня з Савета Міністраў. Ліст гэты падпісаны Леанідам Паўлавічам Гуляка, упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, і з'яўляецца адказам на просьбу тысяч вернікаў, якія звярнуліся да ўладаў з просьбай перагледзець рашэнне адносна рэгістрацыі святароў і законных сясцёр з Польшчы, якія працуюць у нашай Дыяцэзіі. Як Біскуп Гродзенскай Дыяцэзіі і Старшыня Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў Беларусі я некалькі разоў асабіста звяртаўся да ўладаў з просьбай адклікаць рашэнне. Двойчы ездзіў ў Менск і разам з біскупам Антоніем Дзям'янкам і біскупам Уладзіславам Блінам размаўляў на гэту тэму з упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Да сёняшняга дня — 5 снежня — чакаю адказу на ліст, скіраваны мною ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Нягледзячы на ўсе нашыя намаганні атрымаць станоўчы адказ на просьбу Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў пакінуў сваё рашэнне ў сіле: да канца снежня святары і законныя сёстры, якія не атрымалі дазвол на рэгістрацыю, павінны будуць пакінуць месцы сваёй працы і выехаць з Беларусі. У тым жа лісце Савет Міністраў, цытуючы закон Рэспублікі Беларусь, прапануе мне як біскупу, адказнаму за Гродзенскую Дыяцэзію, магчымасць запрашаць іншых святароў з Польшчы. У сувязі з такім рашэннем і прапановай я выказваю свой смутак і пратэст. Улада ў Касцёле, згодна з правам Усеагульнага Касцёла, належыць біскупу. Заканадаўства нашай краіны таксама пакідае дыяцэзіяльнаму біскупу

свабоду выбару пры запрашэнні на працу грамадзян іншых краін. Таму знешняе ўмяшанне ў правамоцную дзейнаснь дыяцэзіяльнага біскупа з'яўляецца парушэннем права і парушэннем свабоды Касцёла. Яшчэ ў чэрвені я прадставіў уладам спіс святароў і законных сясцёр, якія застануцца працаваць у нашай Дыяцэзіі ў 2007 годзе і гэтым выказаў усім ім свой пастырскі давер. Не бачу прычыны, на якой належала б гэты давер адклікаць. Святарам і сёстрам, якім адмовілі ў праве на працу, улады таксама не паведамілі прычыны адмовы, якія б супярэчылі заканадаўству нашай краіны. Я прашу ўсіх Вас, Шаноўныя Святары, законныя Сёстры і Узлюбленыя Дыяцэзіяне, працягваць маліцца. Таксама прашу вас, каб сваю малітоўную салідарнасць з вашым біскупам, святарамі і законнымі сёстрамі вы пашырылі для станоўчага вырашэння справы будоўлі касцёлаў у новых мікрараёнах нашых гарадоў. Свабода Касцёла мае свае карані ў збаўчай місіі Езуса Хрыста, а ў заканадаўстве замацавана з пагляду на непазбыўнае права людской асобы. Мы не можам занядбаць місію, даручаную Касцёлу. Мы жывём таксама ў краіне, якая гарантуе свабоду асобы і не трацім надзеі, што яна будзе шанавацца.

*З малітвай і пастырскім благаслаўленнем,*
*Аляксандр Кашкевіч,*
*Гродзенскі Біскуп*

*Маніторынг складзены паводле ўласнай інфармацыі Хрысьціянскага Праваабарончага Дому, а таксама па матэрыялах сайтаў: www.svaboda.org, www.spring96.org, www.charter97.org, www.newlife.by, www.bchd.info, www.info.belreform.org, www.jesuschrist.ru, www.krinica.org, www.belngo.info, www.zabelarus.info, www.post-golodovka.org, www.churchby.info, www.forum18.org і інш.*



**Павал Севярынец**, хрысьціянін, грамадзкі лідэр, пісьменьнік, з 1999 да 2004 гг. — старшыня «Маладога Фронту».

У 2005 годзе абвінавачаны ў арганізацыі акцыяў пратэсту, якія адбыліся ў Менску пасьля Рэферэндуму. Асуджаны на тры гады абмежаваньня волі, г. зв. «хіміі». З улікам амністыі тэрмін скарочаны да двух гадоў. Адбывае пакараньне на лесанарыхтоўках у вёсцы Малое Сітна ў Полацкім раёне Віцебскай вобласьці.



**Зьміцер Дашкевіч**, эвангельскі хрысьціянін, лідэр «Маладога Фронту». 1 лістапада 2006 г. быў асуджаны на паўтары гады турмы за ўдзел у незарэгістраванай арганізацыі.

Адбывае пакараньне ў Шклоўскай калёніі.

KAMUNIKAT.org

**ХРЫСЬЦІЯНСКІ ПРАВААБАРОНЧЫ ДОМ —**

гэта ініцыятыва, якая ўзьнікла ў адказ на прыцясьненьне беларускімі ўладамі правоў хрысьціянаў.

Сваёй мэтай Хрысьціянскі Праваабарончы Дом бачыць інфармацыйную і юрыдычную падтрымку хрысьціянаў розных канфэсіяў, абарону прынцыпаў справядлівасьці і стандартаў высокай маралі ў беларускім грамадзтве, а таксама інфармаваньне аб сытуацыі ў галіне права на свабоду веравызнаньня ў нашай краіне.

**Кантакты:**
**тэл. +375 29 702 03 05**
**christian.house@gmail.com**
**www.christianhouse.info**

Аргкамітэт партыі «Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя»

# ХРЫСЬЦІЯНСКІЯ ПРЫНЦЫПЫ І БЕЛАРУСКІ ПАТРЫЯТЫЗМ

Беларусь востра патрабуе палітычнай сілы, дзейнасьць якой заснаваная на падмурку хрысьціянскіх прынцыпаў і беларускага патрыятызму. Такой сілай павінна стаць «Беларуская Хрысьціянская Дэмакратыя».

Арыенцірам у нашай дзейнасьці зьяўляецца праца такіх беларускіх дзеячоўхрысьціянаў, як Эўфрасіньня Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францішак Скарына, Мікалай Радзівіл Чорны, Астафій Валовіч, Язэп Руцкі, беларускія хрысьціянскія дэмакраты пачатку ХХ стагодзьдзя.

Беларуская хрысьціянская дэмакратыя выступае за пабудову незалежнай, эўрапейскай, эканамічна і духова разьвітай Беларусі — зямлі, якую даў нам Госпад Бог.

## ЗА ШТО ВЫСТУПАЕ ХРЫСЬЦІЯНСКАЯ ДЭМАКРАТЫЯ?

— за сумленную, маральную, адказную палітыку;
— за абарону хрысьціянскіх каштоўнасьцяў ва ўсіх сфэрах жыцьця;
— за першынство Закону як грунту справядлівага дзяржаўнага ладу й грамадзкага парадку;
— за дзяржаву, якая ставарае максымальна спрыяльныя ўмовы для росквіту сям’і й разьвіцьця асобы;
— за незалежную Беларусь;
— за прыватную ўласнасьць як гарантыю індывідуальнай свабоды;
— за разьвіцьцё беларускай культуры і дыялёг зь іншымі культурамі;
— за разумнае экалягічнае гаспадараньне на сваёй зямлі;
— за адкрытую палітыку ў адносінах з усім сьветам;
— за моцнае мясцовае самакіраваньне;
— за свабоду сумленьня й хрысціянскую талерантнасьць;
— за спрашчэньне бюракратычных працэдур і зьніжэньне падаткаў.

**Кантакты:**
Аляксей Шэін (8-029) 651-26-65
Віталь Рымашэўскі (8-029) 763-59-54
Георгі Дмітрук (8-029) 724-51-56
Павал Севярынец (8-029) 516-08-61
220109, г. Менск, а/с 290
E-mail: bchd.info@gmail.com
Сайт: http://bchd.info